# [Развагі, выклікаными крытыкай творaў Я. Пушчы]

Крытыка гэта ня тое, што ўзяў агл[едзеў] прадм[еты], рас[с]тавіў іх у пэўн[ым] парадку і на тым задаволіўся. Крытыка не надзірацельства, не пракурорства… Крытыка — гэта творчасьць. І куды лягчэй рас[с]т[авіць] прадм[еты], як напісаць крытыку. Бо–ж і тут як перад пісьм[еньнікам] стаяць задачы сабраць матар[’ял] і знайсьці адп[аведную] форму для яго (аформ[іць] мат[ар’ял]). Але самае цяжкае як для пісьм[еньніка] — гэта стварэньне формы. Напіс[аць] крыт[ыку] — гэта значыць напісаць твор. Гэта зн[ачыць] аба[гульніць] суж[джэньні], пал[ажэньні], прыв[есьці] іх у пэўн[ы] пар[адак].

Зах[одзіць] да мяне N і пыт[ае]: „Чытаў П[ушчу], што ты скаж[аш]?“ „Чытаў, але што мне сказаць?“ Добры, кепс[кі] — гэта амаль нічога не сказаць. Ён чыт[аў] і я чыт[аў]. Зн[ачыць], мы нейкі момант жылі гэтым твор[ам], перажывалі адзін прадмет. Думалі пра адно. І зараз, калі ён пыт[аецца], ці чыт[аў], ён факт[ычна] узруш[ае] успаміны аб гэтым моманце пераж[ываньня], будзіць успаміны. Чытаў — гэта знач[ыць] жыў і я гэтым прадм[етам], гэты прадм[ет] напаўн[яў] маю сьвяд[омасьць], уваходзіў і заняў у ёй пэўны куток. Цяпер ён маё. Што я маю ад яго ў сабе? І я кажу: ты пытаеш, што я маю ў сабе? І я кажу: у рэчку ўліўся ручайка і прынёс сюды свой колер і свае гукі. Мы былі адзіны ў П[ушчы], адзінства ў тым, што мы [паяднаны] тым твор[ам] Пушчы, а гэта знач[ыць], што ў нас яшчэ на адно зьвяно павяліч[ылася] агульнага між намі, зьвяно, праз якое мы лучымся ў адзінства, робімся роднымі. Тв[орчасьць] — поле, на якім мы сходзімся і пазнаем друг друга і альбо расх[одзімся] як другі альбо як ворагі. Для мяне было яно дарагім, для вас было яно прыкрым, і вы паліч[ылі] яго за непатр[эбнае]. Гэта знач[ыць], што і я для вас прыкр[асьць], непатрэб[ства], перашкода ў вашых замерах, і вы ўжо, змагаю[чыся] суп[роць] П[ушчы], змагаецеся і са мною, выкід[аючы] яго, вы вык[ідаеце] і дарагое мне. І калі вы кажаце — дрэн[на], гэта зн[ачыць] вы каж[аце], што дрэн[на] і тое, што мне дарага. Вы гэтым самым зьневаж[аеце] і мяне. Калі я кажу, што мне яны дарагія, гэтым сам[ым] я кажу, што мне блізкі і тыя, для каго яны таксама дарагія, я вызн[ачаю] іх родн[ымі] для мяне, я залічаю сябе ў іх сям’ю. Гэтым–жа самым я выключаю сябе з кругу тых, каму ня дарагі гэтыя тво[ры], я адкрыта выступаю перад іх тварам, і кажу я не за іх, а супроць іх. Я выкрываю сябе ў адносінах да іх і тым самым падвяргаю сябе анал[ёгічнаму] нападу на сябе з іх боку. І тут, ясна, патрэбна сьмеласьць і абдуманасьць, патрэбна зрабіць усё, каб быць гатовым прыняць гэту бойку і ня быць пераможаным. Дзеля гэтага я раблю адпаведныя захады, умац[оўваю] сваю позыцыю і яе затуш[оўваю], выстаўляю сваё падобіе на адным месцы, а сам займаю другое, каб з яго ў пэўны мом[ант] выцяць ворага з тылу, альбо раблю падобна на іх, паказв[аю], што ёсьць абуран[ыя] і гатовыя ім дапам[агаць] толькі дзеля таго, каб выклікаць іх на тое, каб яны [занялі] выгодн[ую] для мяне позыцыю.

І мне хацелася–б, каб П[ушча] пережыў вялікае і глыбокае, будзь то радасьць, будзь то сум, бо ён стварыў–бы тады вялікую песьню. Што магу я зрабіць дзеля таго, каб прычыніцца яму ў гэтым пераж[ываньні]? Я толькі магу сказаць свае слова ў надзеі, што яно з часам ператв[орыцца] у дзею.

*[1927]*